# ПАЦЕРКІ КУРГАННАГА МОГІЛЬНІКА ІЗБІШЧА

**М. І. Сцяпанава**

Археалагічны комплекс Ізбішча знаходзіцца на правым беразе р. Дзвінаса – левага прытока р. Вілія. Комплекс складаецца з курганнага могільніка і селішча. Курганны могільнік, што знаходзіўся за два кіламетры на паўднёвы захад ад вёскі Ізбішча ля дарогі на вёску Выгар, быў выяўлены ў 1980 г. М.І. Лашанковым. Ён налічваў не менш за 120 насыпаў. Селішча, размешчанае за 50–70 м ад могільніка ва ўрочышчы Калыскаўка, было адкрыта ў сярэдзіне 1980-х гг М.М. Чарняўскім і М.І. Лашанковым. У 1987–1989 гг. раскопкі на помніку праводзіў

В.У. Казей. За тры палявыя сезоны ім раскапана на знос 85 насыпаў. У 1990–1991 гг. Г.В. Штыхаў даследваў 29 насыпаў. Акрамя гэтага, яшчэ 3 насыпы былі знішчаны скарбашукальнікамі і 3 – засталіся не раскапанымі [6, с. 5–6]. Такім чынам, курганны могільнік Ізбішча можна лічыць адным з нешматлікіх у нашай краіне цалкам даследаваных.

Па выніках раскопак помніка ў 2008 годзе выйшла манаграфія Г.В. Штыхава пад назвай «Могільнік Ізбішча-Дзвінаса». Не гледзячы на тое што аўтар працы пачаў публікаваць асобныя вынікі даследванняў некропаля раней (у 1992, 1996, 2007 гг.), ў названай манаграфіі пададзены найбольш поўныя матэрыялы раскопак курганнага могільніка Ізбішча.

Акрамя таго, вывучэннем пацерак могільніка займалася Т.С. Скрыпчанка. Вынікі яе працы былі апублікаваны ў 1996 і 2010 гг [4; 5]. На жаль, гэтыя артыкулы цалкам пазбаўлены ілюстратыўнай часткі і прысвечаны, у асноўным, вынікам тыпалагічнага даследавання калекцыі ізбішчанскіх пацерак.

Мэтай дадзенага паведамлення з'яўляецца вызначэнне асартыменту і храналогіі раннесярэдневяковых пацерак Беларускага Павілля. Для дасягнення вызначанай мэты ў працы ставяцца наступныя задачы:

- вылучэнне набораў пацерак у пахавальных комплексах курганнага могільніка Ізбішча;
- статыстычная апрацоўка шкляных, каменных і пацерак, выраблены з іншых матэрыялаў;
- вызначэнне храналогіі асобных тыпаў пацерак і іх набораў.

Для вырашэння першай задачы былі ўжыты метады марфалагічнага і тыпалагічнага аналізу. Другая задача абумовіла выкарыстанне метаду статыстычнага аналізу. Пры вырашэнні пытанняў датавання набораў пацерак і пахавальных комплексаў быў праведзены кампаратыўны аналіз матэрыялаў могільніка Ізбішча з матэрыяламі такіх помнікаў, як Ноўгарад і Старая Ладага.

Вынікі дадзенай працы могуць паспрыяць удакладненню храналогіі курганнага могільніка Ізбішча. Улічваючы той факт, што дадзены могільнік з'яўляецца практычна цалкам даследаваным некропалем полацкіх крывічоў, вынікі працы могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі больш дробнай храналогіі пахавальнага абраду ўсёй Полацкай зямлі другой паловы X–XII ст.

Падчас працы з калекцыяй пацерак курганнага могільніка Ізбішча, якая захоўваецца ў музеі Інстытута гісторыі НАН Беларусі[1], было апрацавана 3045 экзэмпляраў, якія паходзяць з 29 курганаў.

[1] Хачу вынесці падзяку выконваючаму абавязкі загадчыка сектара навуковых археалагічных фондаў ІГ НАН Беларусі А.В. Вайцяховічу і Г.В. Штыхаву за дазвол на працу з калекцыяй пацерак курганага могільніка Ізбішча і метадычныя парады.

За аснову для марфалагічнай класіфікацыі ізбішчанскіх пацерак былі ўзяты напрацоўкі Ю.Л. Шчапавай. Марфалагічная класіфікацыя прадугледжвае падзел на аддзелы ў адпаведнасці з формай папярочнага сячэння і на тыпы – у адпаведнасці з формай прадольнага.

Храналагічны аналіз калекцыі зроблены з прыцягненнем адпаведных матэрыялаў Нераўскага раскопа Ноўгарада [7], Землянога гарадзішча Старой Ладагі [2; 3], а таксама археалагічнага комплекса Мініна на беразе Кубенскага возера [1]. Для гэтых помнікаў, за выключэннем Мініна, свораны дэндрахраналагічныя шкалы, што дазволіла даследчыцам адрымаць даволі дробныя даты.

Сярод пацерак курганнага могільніка Ізбішча былі вылучаны шкляныя, сердалікавыя, гліняныя і бурштынавыя экземпляры. Самай масавай знаходкай з’яўляюцца шкляныя пацеркі (99,3% ці 3023 экз.). Колькасць сердалікавых пацерак на дадзены момант раўняецца 20 (прыкладна 0,66%). Бурштынавы і гліняны экземпляры адзінкавыя (па 0,03%).

Пацеркі, выраблены з аднаго матэрыяла, былі падзелены на аддзелы ў адпаведнасці з формай папярочнага сячэння. Сярод шкляных пацерак былі выдзелены круглыя, шматгранныя, сплошчаныя і з разеткай у папярочным сячэнні (ці *рабрыстыя*). Самай вялікай колькасцю экземпляраў прадстаўлены аддзел круглых у папярочным сячэнні пяцерак (97,8% ад усіх шкляных пацерак). Такая рэзкая перавага забяспечана масавасцю паставага бісеру.

У межах аддзелаў у адпаведнасці з формай прадольнага сячэння пацеркі былі падзелены на тыпы, а для шкляных у аднаведнасці з колерам, празрыстасцю і індывідуальнымі асаблівасцямі, такімі, як, напрыклад, прапорцыі – на віды. Шкляныя экземпляры, круглыя ў папярочным сячэнні, паводле велічыні свайго дыяметру падзяляюцца на ўласна пацеркі і бісер. Умоўная (што варта асабліва падкрэсліць) мяжа паміж імі праведзена навукоўцамі ў раёне 5 мм [1, с. 146]. Самай масавай знаходкай не толькі ў калекцыі пацерак, але і цэлым курганным могільніку з’яўляецца зонны паставы бісер разнастайных колераў і з рознай колькасцю сегментаў.

Характэрнай асаблівасцю набора ізбішчанскіх пацерак з’яўляецца практычна поўная адсутнасць зялёных экземпляраў пры значных серыях сініх і жоўтых. Гэтыя коляровыя суадносіны адрозніваюць Ізбішча ад такіх эталонных помнікаў, як, напрыклад, Старая Ладага і Ноўгарад.

У выніку вывучэння датавання асобных тыпаў пацерак, у цэлым, атрымалася выдзеліць дзесяць храналагічных груп.

У першую групу ўключаны экзэмпляры, верхняя дата якіх не выходзіць за межы *X ст.* Да іх належаць 1 шкляная 14-гранная і 1 сердалікавая пацерка манетападобная з пояском.

Другую храналагічную групу складаюць пацеркі, якія датуюцца *X – пачаткам XI ст.* Да іх ліку належаць прадольнапаласатая бела-чорная «лімонка», зонная двухслойная прадольнапаласатая пацерка з двума кшталтамі покрыўнага шкла: белым з чорнымі палоскамі, якое аналагічна шклу папрэдняга экземпляра, і жоўтым з чырвонымі палоскамі; чорныя непразрыстыя пацеркі з рыскавымі чорна-чырвона-белымі вочкамі ў пяцельках. Сюды ж, верагодна, належыць чорная непразрыстая пацерка з манахромнымі зялёнымі вочкамі і адной тоненькай жоўтай пяцелькай. Да другой групу таксама аднесены 14-гранныя і 8-гранныя прызматычныя сердалікавыя пацеркі.

Вельмі блізкую да папярэдняй па храналагічных межах групу складаюць пацеркі *X – сярэдзіны XI ст.* Сюды былі аднесены сечаны бісер розных колераў і памераў, адна- і двухслойныя «лімонкі» (жоўтыя, белыя, празрыстыя бясколерныя і сінія). Абсалютная большасць «лімонак» з'яўляюцца адна- і двухчасткавымі. Жоўтыя лімонкі падзяляюцца на тры варыянты: аднаслойныя, двухслойныя з празрыстай бясколернай сярэдзінай і двухслойныя з празрыстай жоўтай сярэдзінай.

Наступную храналагічную групу складаюць пацеркі, асноўны час распаўсюджання якіх прыпадае на *X–XI стст.* Да гэтай групы належаць: жоўтая непразрыстая пацерка, упрыгожаная белымі вочкамі з чорнымі рыскамі, золата- і срэбрашкляныя лімонападобныя пацеркі, прызматычныя 4-гранныя пячонкава-чырвоныя пацеркі, усе тыпы навітых манахромных сініх пацерак, пафарбаваных кобальтам (зонныя, кольцападобныя, эліпсоідныя, кроплепадобныя), бітрапецоідныя пацеркі з суадносінамі вышыні і дыяметра, роўнымі 1:2 (блакітныя і фіялетавыя празрыстыя, а таксама светлы паставы экземпляр); сердалікавыя шарападобныя пацеркі.

Пятую храналагічную групу складаюць пацеркі, якія датуюцца *канцом X – пачаткам XII* стст., найбольш распаўсюджаныя, як правіла, у XI ст. Аснову гэтай групы складаюць золата- і срэбнашкляныя пацеркі, вырабленыя індывідуальна ў тэхніцы навіўкі (золаташкляныя бачонкападобныя круглыя; цыліндрычныя круглыя золата- і срэбрашкныя; бітрапецоідныя круглыя золаташкляныя; золаташкляныя бітрапецоідныя і цыліндрычныя рабрыстыя, а таксама золата- і срэбнашкляныя зонныя рабрыстыя; цыліндрычныя рабрыстыя з пункцірам у жалабках).

У наступную, шостую, групу ўключаны пацеркі шырокага храналагічнага дыяпазона – *X–XIII ст.* У яе ўвайшлі ўсе рабрыстыя манахромныя (сінія, блакітныя зонныя і бірапецоідныя экземпляры); сердалікавыя бітрапецоідныя пацеркі з гранёным пояском; бурштынавая бітрапецоідная пацерка.

Сёмая група пацерак, якія датуюцца *XI – першай паловай XII* ст., прадстаўлена толькі адным тыпам. Гэта так званыя трохкутныя з жоўтымі паставымі ўстаўкамі пацеркі.

*Табліца*

| Пахавальны абрад | № кургана | Датаванне пахаванняў паводле Г.В. Штыхава | Датаванне пахаванняў паводле probораў пацерак |
|---|---|---|---|
| Крэмацыя | 58 | | Другая палова X ст. |
| Бірутальныя пахаванні, пацеркі ў інгумацыях | 24 | | Пачатак XI ст. |
| | 28 | | XI – першая паловаXII стст. |
| | 55 | | XI ст. |
| Інгумацыя на старажытнай дзеннай паверхні | 1 | | XI ст. |
| | 2 | XI – магчыма, XII стст. | XI ст. |
| | 19 | | Сярэдзіна – другая палова XI ст. |
| | 20 | Другая палова XI ст. | XI ст. |
| | 37 | | Першая палова XI ст. |
| | 47 | | Пачатак XI ст. |
| | 57 | | Пачатак XI ст. |
| | 61 | | XI - самы пачатак XII ст. |
| | 82 | | XI ст. |
| | 86 | | Пачатак XI ст. |
| | 92 | | Канец X – першая палова XI ст. |
| | 98 | | Першая палова XI ст. |
| | 105 | | XI ст. |
| | 108 | | Пачатак – трэцяя чвэрць XI ст. |
| | 109 | | Пачатак XII ст. |
| | 114 | | Першая палова XI ст. |
| Інгумацыя ў падкурганнай яме | 26 | Канец. X ці пачатак XI ст. | Канец X - пачатак XI ст. |
| | 36 | | Першая палова XI ст. |
| | 43 | | самы канец X - XI ст. |
| | 49 | | Канец X - XI стст. |
| | 51 | | XI ст. |
| | 52 | | Канец X – пачатак XI стст. |
| | 89 | | Першая палова XI ст. |
| | 91 | | XI ст. |
| | 99 | Канец X - пачатак XI стст. | XI ст. |

Восьмая храналагічная група пацерак *XI–XIII стст.* самая буйная па колькасным, але не тыпалагічным складзе, бо сюды ўваходзіць, у асноўным, паставы зонны бісер жоўтага і цёмнага колераў, а таксама зялёны празрысты зонны бісер. Акрамя гэтага да восьмай групы аднесена рыбападобная пацерка жоўтага непразрыстага шкла.

У дзевятую групу ўключаны пацеркі, асноўны час распаўсюджання якіх прыпадае на *XII–XIII стст*. Сюды належаць зонныя жоўтыя непразрыстыя, эліпсодныя зялёныя і чорныя, бітрапецоідныя з прапорцыямі 1:1.

Апошняя, дзесятая група прадстаўлена двума экземплярамі сініх вінтавых пацерак, аналагі якіх у Ноўгарадзе раўнамерна сустракаюцца ў пластах *другой паловы XII – першай паловы XIV ст.* [7, с. 172].

З 29 даследаваных набораў пацерак адзін паходзіў з пахавання па абрадзе крэмацыі, астатнія – з інгумацый на старажытнай дзённай паверхні і з інгумацый у падкурганнай яме. Адно з трупапакладаннеў было мужчынскім (курган 28). Знаходку нізкі пацерак ля шыі нябожчыка [6, с. 9] у дадзеным выпадку варта трактаваць як замагільны дарунак.

Спалучэнні пацерак, прыналежных да розных храналагічных груп, у межах аднаго набора далі магчымасці больш вузка датаваць некаторыя пахаванні. А пры адсуднасці такой магчымасці былі прыцягнуты іншыя артэфакты з пахавальнага інвентару. Прыцягненне вынікаў найноўшых даследванняў дазволіла звузіць некаторыя даты, прапанаваныя Г. В. Штыхавым. У *Табліцы* прыведзены датаванні Г.В. Штыхыва і атрыманыя ў выніку дадзенай працы. Апошнія даты атрыманы не толькі ў выніку даследвання храналогіі выключна набораў пацерак пэўных пахавальных комплесаў, але шляхам іх супастаўлення з датаваннямі іншага пахавальнага інвентару. Гэта аперацыя часама дазваляе адсекчы адрэзкі часу з таго ці іншага боку і такім чынам звузіць мяркуемую дату пахавання. У выніку праведзенай працы было высветлена, што абсалютная большасць пахаванняў, якія ўтрымлівалі пацеркі, была здзейснена ў XI ст. Адно пахаванне па абрадзе крэмацыі (курган 58) адбылося ў межах другой паловы X ст. Яшчэ адно пахаванне па абрадзе інгумацыі на гарызонце было здейснена ў пачатку XII ст.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што паступленні набораў пацерак ў пахавальныя комплексы адбываліся з другой паловы – канца X ст. да пачатку XII ст.

**Літаратура**

1. Археология севернорусской деревни X–XIII веков: средневековые поселения и могильники на Кубенском озере: в 3 т. Т. 2: Материальная культура и хронология / [ред. С.Д. Захаров]. М., 2008.
2. *Львова З.А.* Стеклянные бусы Старой Ладоги. (Ч. I. Способы изготовления, ареал и время распространения). // Археологический сборник Государственного Эрмитажа. Л., 1968. Вып. 10. С. 64–94.
3. *Львова З.А.* Стеклянные бусы Старой Ладоги. (Ч. II. Происхождение бус). // Археологический сборник Государственного Эрмитажа. Л., 1970. Вып. 12. С. 89–111.
4. *Скрипченко Т.* Бусы Избищенского могильника (хронология и происхождение). // Тэзісы дакладаў і паведамленняў Беларускай дэлегацыі на VI Міжнародным кангрэсе славянскай археалогіі. Ноўгарад, 26–31 жніўня 1996 г. Мн.: 1996.

5. *Скрипченко Т. С.* Бусы Избищенского могильника // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мн., 2010. – Вып. 19. С. 217–221.
6. *Штыхаў Г.В.* Могільнік Ізбішча-Дзвінаса / Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мн., 2008. – Вып. 16.
7. *Щапова Ю.Л.* Стеклянные бусы Древнего Новгорода // Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1956. Вып. 55. С. 164–179.